## Снежань

**1/18.** Лічылася: калі ў гэты дзень пагодна -- пагодлівая і ранняя будзе вясна (БСК, 1939).

**2/19.** Якое надво'е 2 снежня -- такое чакаецца і ў сенакос. (БСК, 1939).

**3/20.** Па гэтаму дню вызначалі надвор'е ў жніво. (БСК, 1939).

**4/21. Увядзенне (Вадзенне, Уводзіны).**

Ён звязаны з хрысціянскім святкаваннем Увядзення ў храм Прасвятой Уладарніцы нашай Багародзіцы і Прыснадзевы Марыі. Бяздзетныя бацькі Іаакім і Ганна, якія паабяцаўшы, што ў выпадку нараджэння ў іх дзіцяці, то прысвецяць яго на служэнне Богу. І вось у гэты дзень трохгадовая атраковіца пры запаленых свечках падымаецца па пятнаццаці прыступках храма і яе першасвятар уводзіць у Святая Святых. Для хрысціян гэтае свята -- сімвал увядзення грэшнага свету ў храм, без якога ён загіне, пачатак уратавання.

У народзе назва прысвятка звязана са словам "вядзенне" ("водзяцца ваўкі", "вадзілі Варвару"). Кажуць: "Увядзенне, што свят навядзе", "На Увядзенне бывала лядзенне", "Увядзенне прыйшло -- зіму прывяло". Або вось як тлумачылі ў Рэчыцкім Палессі: «Кажуць, што гэтае свята – у памяць пакут св. Варвары: «Як святую Варвару погань мучыла, што перш вадзіла па сялу на повадзе да й біла; затым етае свята завецца «Вадзенне» (Пяткевіч, 1938).

У некаторых рэгіёнах Увядзенне лічылася як адно з дзявочых святаў, калі «дзяўчаты збіраліся на ігрышча і куміліся» (Рагачоўскі р.; Васілевіч, 1998), а таксама вечарам варажылі: «Святое Увядзенне, вядзі мяне туды, ідзе мне жыць» (Косіч, 1901).

У сербаў і чарнагорцаў існуюць забароны на дакрананне да вострых прадметаў, каб ваўкі зімою не нападалі на жывёлу (КЗ, 1973. С. 236).

***Барбара (Варвара).***

Частуюцца варанымі або печанымі варэнікамі з макам, мёдам ці канаплямі (Берман, 1874). Звязаныя з Варварай прыказкі напамінаюць аб дні зімовага сонцастаяння: "Барбара ноч урвала, а дзень надтачыла" (Сахараў, 1937), аб надыходзе зімы: "Барбара масціць, а Мікола гваздзіць" (БГК, 1926), "На Барбару мароз -- рыхтуй ужо воз" (БСК, 1937).

Французы лічаць Варвару абаронцай ад гвалтоўнай смерці, малані і апякункай пажарнікаў, маракоў, каменшчыкаў і розных рамесленікаў. У немцаў святая – абаронца гарнякоў і артылерыстаў. Католікі-фламандцы і валлоны ў гэты дзень зразаюць галінкі вішні ці бярозы і ставяць у ваду, каб распусціліся да Раства. Італьянцы раяць на Барбару сядзець у хаце і агонь падтрымліваць. Палякі мяркуюць: калі на Барбару мароз то неабходна рыхтаваць воз, а калі слякаць – то сані (Ярмолаў, 1901. С. 576). У Балгарыі дзяўчаты ў хатах спявалі варваркі аб здароўі і ўрадлівасці, існавала рытуальная страва «варвара», абрадавы хлеб, «колак», «кравай», «харман». Грэкі лічаць Варбару абаронцай дзяей ад оспы. (Гл. таксама 17 снежня).

**5/22. *Савы.***

У кожнага прысвятка, згодна ўяўленню народа, свая функцыя: "Барбара мосціць, Сава цвікі войстрыць, а Мікола прыбівае" (БК, 1957).

Румыны паўсюдна адзначалі дзень памяці святога. У некаторых раёнах лічаць, што Сава – гэта святая жанчына, якая хварэла воспаю і таму аслабла (КЗ, 1973. С. 286).

(Гл. таксама 18 снежня).

**Пракоп.**

У Паазер'і сяляне талакой расстаўлялі вешкі ля дарог, каб не збіліся са шляху падарожнікі, ачышчалі сцежкі. З хрысціянскім пакутнікам Пракопам звязана народная прыказка: "Прыйдзе Пракоп хмуры -- раскапае гуры" (Ляснічы, 1990).

У дадзеным выпадку народны погляд спыніўся на пакутніку Пракопію (303 г.), які ў царкоўным календары на гэты дзень займае не першае месца, а сярэдняе ў спісе святых, што складзены па храналагічнаму прынцыпу.

**6/23. Матрыхваны (Матрыпан).**

Дзень вольны ад прадзення ў пііліпаўскія вечары. У Лельчыцкім раёне гавораць: "Матрыпан у Піліпаўку празьнікуюць, штоб не прасьці" (Талстая, 1986). Дзяўчаты варажылі пра замужжа. У Ельскім раёне ўспамінаюць: "Возьмуць да рошчэшуць косы грэб'ёнкаю, тэю, што мічуць, да штоб ніхо не чуў, ложыліса, пуд подушку грэб'ёнку ложаць: "Здайся ў сьне, з кім я стану ў пары па вясьні". То прыйдуць з гулянкі, цёмно, ужэ ўсі спяць. Шоб ніхто не гаворыў до цебе і ты ні з кім не гаворыла, бо як загаворыш, то ўсё пропало" (Талстая, 1986).

У царкоўным календары -- святы Мітрафан Варонежскі (1623-1703 г.г.), матэрыяльна падтрымліваў цара Пятра І у яго дзяржаўных і ваенных справах.

***Мікола.***

Прысвятак у католікаў (гл.19 снежня).

**7/24. Кацярыны.**

Прысвятак у памяць вялікапакутніцы Кацярыны, якая жыла ў Александрыі, валодала незвычайнай прыгажосцю, вучонасцю, мудрасцю і майстэрствам лячэння. Яна сасніла, што сам Ісус Хрыстос назваў сваёй нявестаю і азнаменаваў яе каштоўным пярсцёнкам. Аддаўшыся вераю Богу, Кацярына выкрывала язычнікаў, цярпела ганенні ад Максіміяна і ўрэшце была жорстка катавана. Вялікапакутніца ў народзе лічыцца памочніцаю пры хваробах дзетанараджэння.

У беларускай традыцыі нездарма яе шанавалі жанчыны. Адзначалі свята Свечкі. Дзяўчаты варажылі ў гэты дзень. Захаваліся прыказкі: "Кацярына забрала край, лета стала карацейшае" (Берман, 1873).

**9/26. Юр'е Зімовы (Юр'еў дзень, Ягорый, Цуды, Асенні Юрай).**

У царкоўным календары -- Асвячэнне храма Вялікапакутніка Георгія (Юрыя -- па-беларуску) ў Кіеве.

На Юр'е зіма ўбіраецца ў поўную сілу. Аб гэтым сведчаць прыказкі і прыкметы: "Ёсць на свеце два Юр'і і абодва дурні: адзін халодны, а другі галодны", "Юры (Ягорый) мосціць, а Мікола гвоздзіць", "Да Юр'я хлеба (сена) і ў дурня", "Колькі на асеняга Юр'я снегу, столькі на вясенняга -- травы".

Юрый лічыўся апекуном хатняй і лясной жывёлы, ваўкоў. У гэты дзень ён нібы выпускаў ваўкоў аж да вясенняга Юр'я. Гаспадары аглядалі кароў, коней:

падразалі хвасты, падстрыгалі грывы. Больш не выганялі на пашу кароў, бо "Юрэй ужэ дае ваўкам слабоду" (Случчына; Сержпутоўскі, 1930).

Вядома гістарычная прыказка: "Вось табе, бабуля, і Юр'еў дзень". Ад Юр'я сялянам не дазвалялася пераходзіць на службу ад аднаго пана да другога.

***Ганны.***

Па прысвятку арыентаваліся аб канкрэтных тэрмінах наступлення святаў. "Ад Ганны да Каляд два тыдні і два дні".

Фіны на Ганну (Анні, Аннікі, Аннелі і інш.) рыхтаваліся да Раства і гаварылі: «Ганна варыць піва,... месіць хлеб» (КЗ, 1973. С. 128). Балгарскія дзяўчаты гадалі аб замужастве.

Як і беларусы (гл 22 снежня), румыны звязвалі Зачацце Анны (Ana Zacetenica) з днём сонцастаяння. Адны лічылі, што з гэтага дня «сонца паварачвае на лета, а певень – на парог!» і дзень падаўжаецца, а ў іншых раёнах краіны – ад Анны і да Спірыдона (12 снежня) дзень і ноч «стаяць на месцы», а дзень пачынае прыбаўляцца толькі са Спірыдона (КЗ, 1973. С. 287).

**13/30. Андросы (Андрос, Андрэй, Андрэйкі).**

Дзявочае свята. Народная традыцыя амаль нічым не звязана з хрысціянскім праслаўленнем апостала Андрэя Першазванага. Гэта адзін з 12-ці вучняў Хрыста, брат святога апостала Пятра. Калі зыйшой Святы Дух, апостал Андрэй з Віфсаіды прапаведваў у І стагоддзі Евангелле ў розных краінах, у тым ліку і на нашых еурапейскіх землях. У Кіеве ён на высокай гары ўстанавіў крыж. Празваны Першазваным таму, што першы быў прызваны Хрыстом на апостальскае служэнне.

Беларуская народная традыцыя захавала нямала абрадаў, гульняў, прыкмет і асабліва варожбаў на гэты дзень. На Палессі кажуць: " Трэба было табе не андросіці (святкаваць), да кудзелю кудосіці", "Андрос, Андрос, мучкі кудось, бо мне трэба дзяцей адзяваць". Дзяўчаты варажылі так, як і перад Новым годам: на бліны, крычалі ў калодзеж і абсявалі яго каноплямі, бегалі пад суседскія вокны пачуць пра што гавораць у хаце і інш.

У Паазер'і прыслухоўваліся, як паводзіць сябе вада ў калодзежах: калі ціхая -- на добрую зіму, а шуміць -- маразы, завірухі і буры разгуляюцца (Ляснічы, 1990). У некаторых мясцінах дзяўчаты праводзілі абрад "сеяння каноплі (лёну)", які цяпер успрымаецца як забава моладзі. "Гэто на Ондрэя коноплі сеялі. Святы Ондрэй, Ондрэй, коноплі посей. Сыпнуць у акно да слухаюць, што там у хаці скажуць. Як скажуць "сядзь", то замуж не вуйдзе, будзе дома сядзець" (Тураўскі сл., 1982). Яшчэ абсыпалі свае ложкі льняным і канапляным семем са словамі: "На цябе, святы Андрэю, лён сею! Дай, Божа, знаці, з кім буду гараваці!" І чакалі хто прысніцца. У Свіслацкім раёне дзяўчаты зубамі (без дапамогі рук) адкусвалі галінку вішні, ставілі яе ў пляшку з вадою і назіралі: у каторай расцвітала галінка, то тая дзяўчына павінна выйсці замуж.

Дзявочая варажба, абрады-забавы «сеяння» шырока вядомы ўсходнім славянцам. На Украіне акрамя гэтага на Андрыя хлопцы выраблялі розныя штукарствы, «бясчынствы» (Коваль, 1995. С. 14-16).

Паўсюдна ў Югаславіі адзначалі дзень Андрэя (Andrej, Andraz, jandrevo -- славенск.; Мечкодав, Мечкин дан – сербека харв.); у некаторых раёнах Сербіі як мядзвежае свята (лічылі, што Андрэй ездзіць на мядзведзе, варылі яму кукурузу,

сухія грушы), усюды як дзявочае свята (існавалі звычаі, каб прыснiўся жаніх і інш.) (КЗ, 1973. С. 236).

Насычанасць фальклорным матэрыялам, не звязаным непасрэдна з функцымі Андрэя Першазванага, дае падставу на меркаванне аб наяўнасці ў дахрысціянскі і хрысціянскі перыяды ў гэты дзень іншага паганскага святкавання. Пераплеценне хрысціянскага монатэізма з паганскім пантэізмам нарадзіла гэтую сінкрэтычную традыцыю, што захавалася ў памяці народа.

**14/1. Навум.**

У царкоўным календары адзначаецца дзень прарока Навума, аднаго з 12 малых прарокаў з паўночнай Палесціны. Вядомы як прапаведнік і аўтар старазапаветнай кнігі. Магчыма па сугуччы ў іменні прарока "ум" народная мудрасць стварыла прыказкі: "Навум розуму вучыць" (Паўлюкоўскі, 1934), "Прарок Навук ставіць на вум" (БК, 1937), «З Навума пачыналі вучыць грамаце» (Васілевіч, 1998). Раней некаторыя сяляне пачыналі ад прысвятка вучыць грамаце сваіх дзяцей. З гэтым лічыліся і вясковыя школы.

У некаторых рэгіёнах Румыніі таксама адзначалі дзень Навума Вучонага (1 снежня). Раней бацькі, што ведалі грамату, сядалі з дзецьмі за буквар.

Рускія называлі Навума «Грамотником».

**17/4. Варвары (Варвара, Варкі, Міколіна матка).**

У старажытнасці, відаць, адзначалі дзень зімовага сонцастаяння, таму шмат дзе распаўсюджана прымаўка: "Варвара ноч урвала, а дзень надтачыла". А ў Свіслацкім раёне гавораць: "Мікола і Варвара ноч урвалі". Іншыя прыказкі ўказваюць на прыналежнасць прысвятка да зімы: "Прыйдзе Варвара, маразы і заварацьˮ, "Як ударыць Варвара -- беражы нос ды вуха" (Ляснічы, 1990).

У гэты дзень пастухі збіралі "варваршчыну" -- традыцыйную плату (Тураўскі сл., 1982). Жанчыне не пралі, бо нібыта "Варвара верацёнамі замучана". У Брэсцкім раёне гаварылі: "Еслі на Варвару после захода сонца прадзеш, то Варвара прынясе сорак верацён, шоб прала за адзін вячор. Одна жэнчына так на каждое верэцено напрала по дзве ныткі і выбросіла Варвары на двор" (Талстая, 1984).

Варылі варэнікі з грэчневай мукі, канапель і падавалі з канаплянай "маслянкаю", макам, або мёдам. На Палессі дзеці хадзілі па варэнікі да сваіх бабуль. На Смаленшчыне Варвару называлі Міколінай маткай (Дабравольскі, 1914).

Добра была развіта і царкоўная традыцыя ўшанавання вялікапакутніцы з асвячэннем свечак і прасвіры, вячэрай і спяваннем псалмаў. У Чавускім раёне гавораць: «Варвара – ета мучаніца, яна верыла Богу, а бацька яе ізбіваў за ета...» (Басько, 1997).

Прысвятак лічыўся Серадапосцем -- сярэдзінай Каляднага посту, як Хрэсцы на Вялікі пост, і асабліва ўшаноўваўся ў надрэчных вёсках Ашмянскага павета, каб жывёла і дзеці не ўваліліся ў ваду і не тапіліся.

У народаў Югаславіі Барбара – апякунка гарнякоў і швеяў. У абрадах таксама праяўляецца іх аграрны змест. Існаваў складаны рытуал прыгатавання традыцыйнай стравы (варица – сербы, vara – харваты, вариво – чарнагорцы), пра якую распявядае прымаўка: Варварыца варыць, Савіца студзіць, Міколіца есць. У

гонар святой калядавалі дзеці, асабліва ў Славеніі. Бытавалі павер'і і варажба (КЗ, 1973. С. 237-238).

Акалічнасці, што ўказваюць на напрасную і нечаканую смерць, збліжае народную традыцыю з гісторыяй вялікапакутніцы Варвары. Багаты язычнік Дыяскор каля 306 года ў Іліаполе фінікійскім адсёк сваёй дачце галаву мячом за тое, што яна прыняла тайнае хрышчэнне і нават пад цяжкімі пакутамі не адраклася ад веры Хрыстовай. Перад гэтым святая малілася, каб Выратавальнік аберагаў усіх ад напраснай і нечаканай смерці без пакаяння, хто шануе і памятае Варвару.

**18/5. Савы (Сава, Саўка, Міколін бацька).**

Лічыцца бацькам Мікалая, патрабуе: "Святкуй мяне і бацьку майго!" (Дэмбавецкі, 1882; Раманаў, 1912; Дабравольскі, 1914). У народзе гаварылі па-рознаму: "Колісь на Варвары нічога не рабілі, а на Саву маталі клубкі на матужкі" (Мазырскі р.; Талстая, 1984), "На Савы не пралі, тоўклі просо, ячмень на куццю, жыто малолі на коляднікі, постолы плелі, волокі вілі (Лельчыцкі р.), "На Савы не трэба прасьць. Не трэба круціць, каб добра было скату, бо скруціцца ягнёнак у калясо" (Шумілінскі р.). Таксама казалі: "Сава мосце, а Мікола гвоздзе", «Хіцер Зміцер, ды і Саўка не дурны» (Сержпутоўскі. С. 278).

Сава ў народным уяўленні, які нібыта з'яўляецца бацькам наступнага свята, не мае падобнасці з гістарычным прататыпам прападобным Савай Асвечаным, які памёр у 532 годзе і вядомы ў хрысціянскім свеце па заснаванаму ля Іардана манастыру, што носіць яго імя, створанаму ім іерусалімскаму богаслужбоваму статуту і іншым.

**19/6. Мікола Зімовы (Міколы, Мікольшчына).**

Багата адлюстраваны ў прымаўках: "Варвара мосціць, а Мікола марозам гвоздзіць", "Юрай мосціць, а Варвара разварвае, а Мікола гвоздзіць", "Без Міколы не бывае ні зімы ні лета", "Да Вясенняга Міколы няма вясны, а да Асенняга -- няма зімы", "Хвалі зіму па Міколе", "Да Міколы няма зімы ніколі", "Ніводнаму Міколе не вер ніколе", "Зімовы Мікола каня заганяе". Хаця Міколам "не верылі", аднак прыкметы існавалі. У Магілёўскай губерні назіралі: калі іней з'явіцца раней Міколінага дня, то неабходна будзе сеяць ранні ячмень (Дэмбавецкі, 1882). На Старадарожчыне лічаць: як да Міколы не выпадзе снег, то доўга не зазелянее трава.

У Лельчыцкім раёне гаворадь, што на Пілінаўку ёсць тры "святкі" -- яны ідуць адзін за адным -- Варвары, Савы і Міколы, калі не трэба "ні снаваць, ні ткаць".

На Случчыне была зафіксавана і іншая роля Міколы: "Мо ніхто так не ратуе на вадзе, у дарозе ці на вайне, як святы Мікола" (Сержпутоўскі, 1930).

Некалі ў гэты дзень праводзілі Мікольшчыну -- свята свечкі. Гаспадар, які меў Мікольскую свечку, частаваў "братчыкаў". Затым запаленую свечку ставілі ў лубок з жытам і пераносілі ў суседную хату, дзе ў наступным годзе меліся адзначаць Мікольшчыну. Па дарозе спявалі:

Прашу цябе, Мікола, да сябе,
Штобы ты ў мяне гадуваў,
На коніку прыязджаў,
Хлеба, солі засылаў,
Усякія пашніцы

І ярыя пшаніцы.

У Парэцкім павеце дзяўчаты клікалі хлопцаў на "мікольскія бліны" (Дабравольскі, 1914); у Гомельскім -- гулялі яшчэ ў "Салоху", маскарадную гульню, калі па хатах хадзілі "цыгане", "варажылі" гаспадарам, спявалі песні (Шэйн, 1902).

Як і многія святы і прысвяткі ў гонар гістарычных асоб і гэты дзень, што прызначаны свяціцелю Мікалаю, архіепіскапу Мір Лікійскіх, цудатворцу, сваім зместам не адлюстроўвае ні біяграфію, ні жыццёвых подзвігаў гэтага вядомага не толькі ў хрысціянскім свеце чалавека, які жыў у другой палове III стагоддзя ў Малой Азіі.

Рускі селянін лічыў Міколу другім пасля Бога заступнікам, апекуном земляроба і жывёлагадоўлі.

У палякаў святы выконвае шлюбныя функцыі. Раніцай паненкі шукаюць пад падушкай вестачку ад абраніка.

У Францыі з Мікалаем звязаны прыкметы аб наступаючай зіме, да яго звяртаюцца аб уладкаванні спраў з вяселлем. Асабліва папулярны святы сярод дзяцей. На дзіцячае свята выхаванцы атрымліваюць салодкія падарункі. Дзеці Пірэнейскага паўвострава таксама шануюць святога, наогул у школьнікаў і студэнтаў ён – абаронца. Асаблівыя святкаванні адбываюцца ў католікаў і пратэстантаў Бельгіі і Нідэрландаў. Святы Мікалай з'яўляецца напярэдадні свята на белым кані ці асле і вельмі падобны на Дзеда Мароза. У яго мяшок з падарункамі і розгамі для непаслухмяных дзяцей (КЗ, 1973. С. 72-73). У многіх народаў Еўропы існуе звычай выстаўляць перад сном абутак, у які Мікалай пакладзе падарункі. Існуе меркаванне, што гэты звычай узнік на аснове царкоўнага вобраза Мікалая як добродетеля (згодна гісторыі святы падкінуў у акно тры вузелкі з золатам на прыданае тром бедным сёстрам, якія зусім згубілі надзею) (Міфы, 1992. С. 217).

У Германію культ Мікалая, дзе ён быў апекуном судаходства, гандлю, а таксама найбольш важных рамёслаў, прыйшоў з Паўночнай Францыі і Фландрыі ў Х-ХII ст. У дзіцячым свяце захаваліся як хрысціянскія, так і язычніцкія элементы (с. 141).

У фінаў Мікалай (Ніку, Нійло, Клаус і інш.) не меў такога значэння як у Заходняй Еўропе, ён быў апекуном птушак, а ў Інгерманландыі – мора (с. 127). У сербаў і чарнагорцаў Мікалай – абаронца сям'і, акрамя таго ў некаторых абласцях Славеніі – апякун мараплавальшчыкаў, дрывасекаў, пілавальшчыкаў, сплаўшчыкаў лесу, млынароў (с. 238). Некаторыя звычаі разам з праваслаўнымі і католікамі, выконвалі і мусульмане.

У абрадах і звычаях румынаў на дзень Мікалая, які адзначаецца 6 снежня, даволі шырока праглядаюцца і язычніцкія рысы, асабліва ў звычаі Муджыеры (Mugieri) або Блекавіцэ (Blekovite). Ён падобны крыху на ваджэнне «казы». Румынскі «казёл» (jarac) толькі званіў у званочак і патрабаваў салі. Свае ролі таксама выконвалі «акцёр» або «дзед», «кот», «дзяўчына» і «певунок». У Букавіне лічылі, што Мікалай спыніў сусветны патоп і выратаваў плот Ноя, таму яго ганаравалі як апекуна маракоў (с. 286).

Балгары да апекуна мораў рыхтавалі рытуальную страву «рыбнік», і раздавалі «на здароўе» маракоў і рыбакоў.

Наяўны беларускі матэрыял, а таксама народаў Еўропы, пацвярджае думку Б.Рыбакова, аб наяўнасці нейкага вадзянога культа, які раней быў на месце Міколы. Разглядваючы быліну пра Садко і іншыя гістарычныя дакументы, даследчык прыходзіць да вываду: «Мікола Зімовы», ён жа «Мікола Мокры», «Мікола Марскі», што патрабуе чалавечых ахвяр для возера, -- прамы наследнік архаічнага Вадзяніка, Паддонага князя, які «требует живой головы во син – море» (Рыбакоў, 1988. С. 277).

Больш папулярным, чым ва ўсходніх славян, Мікалай у Заходняй Еўропе. Яго вобраз зведаў большай ступені фальклярызацыі асабліва дзякуючы навейшай дзіцячай раждзественска-навагодняй «міфалогіі», якая дала свету Санта-Клауса (ад сапсаванага галандскага Sinte Klaas).

*Адвент.* Тры тыдні перад Раством. Каталіцкае свята непарочнага зачацця Божай Маці.

Хрысціянаская царква разглядае Адвент як час духоўнай падрыхтоўкі да святкавання Раства, якое заключаецца ў пасце і пакаянні. Нават у ім даследчыкі знаходзяць напластаванні старадаўніх народных уяўленняў. Ён бачыцца як небяспечны перыяд і пара забаў (КЗ, 1973. С. 35). Асабліва нямала народных звычаяў і прыкмет, звязаных з Адвентам, захавалася ў немцаў (с. 147-148).

**22/9. Ганны (Ганкі, Ганна).**

Прысвятак, што падобны на Савы. Да каляд застаецца роўна два тыдні. "Ганкі -- пошчытаны дынькі" (Драгічынскі р.), "Ганны -- прыбавіцца багата дня" (Мазырскі р.; Талстая, 1984). Падлік днёў звязаны і з больш глыбокімі каранямі. Як вядома, 21 або 22 снежня з'яўляецца днём астранамічнага зімовага сонцастаяння, на што вялікую ўвагу звярталі яшчэ язычнікі.

Беларусы Смаленшыны пра прысвяткі ў канцы года казалі: "Варвара, Саўка, Мікола і Андрос ішлі ўмесце; Ганна засталася за красачкамі, а будні дзень і наступіў" (Дабравольскі, 1894). На Брэстчыне так заўважаюць: "Варвара заварыць, а Мікола пацвердзіць, а Ганкі зоб'юць санкі і поедуць катацца по снегові, по ледові" (Талстая, 1984). Найбольш распаўсюджана прымаўка: "На Ганкі сядайце на санкі". У Іванаўскім раёне гавораць: "На Ганкі запрагай каня ў санкі" (Стасевіч, 1991).

Яшчэ фальклярыст М.Нікіфароўскі заўважыў: «Па зіме і лета» – звычайна гавораць пра летняе надвор'е, калі параўноўваюць яго з перажытым зімовым. Гэтае параўнанне ідзе ад зімовае Ганны і ад дня паавароту сонца на зіму (22 чэрвеня), што адбываецца за 20 дзён да Пятра. Пры гэтым суадносяць: снег – з дажынкамі, мяцеліца – з ветрам і дажджом, мароз – з ясным надвор'ем, адлігу -- з цёплым дажджом» (1897. С. 211).

Гэты прыкметны ў годзе дзень (з астранамічнага пункту погляду) прысвечаны шанаванню праведнай Анны, якая пасля дваццацігадовага бясплоддзя зачала Прасвятую Багародзіцу. Католікі прысвячаюць гэтай падзеі 26 ліпеня, дзень блізкі да летняга раўнадзенства.

У рускіх прысвятак мае больш хрысціянскі выгляд ужо па сваёй назве. «На Зачатье св. Анны беременным бабам пост» (Ярмолаў, 1901. С. 583).

**24/11. *Посная куцця.*** Пачатак ***Каляд*** (да 6 студзеня)**.**

Дзяўчаты варажылі, ці хутка выйдуць замуж. Насілі з песнямі "звязду". Бытавалі прыказкі і прыкметы звычайна тыя, што і ў праваслаўных: "Прыйшлі Калядкі, гаспадарам парадкі", "Калядкі -- добрыя святкі: бліны ды аладкі", "На Каляды мяцеліца -- на пчолы ўраджай; неба зорнае -- ураджай на гарох", "На Каляды вецер -- летам шмат гарэхаў; неба зорнае -- будуць й ягады", "На Калядах ясна -- ясна й на Пятры" (БСК, 1937).

Цікава рабілі абрадавую вячэру «куццю» беларусы ў Латвіі: "Стол для вячэры засцілаецца чыстым абрусам, пад які кладуць сена, што потым аддаюць жывёле; на стале пад абразамі ставіцца абавязкова міска з куццёй, прыгатаванай з пшанічнага зерня і падсалоджанай мёдам. Пасля вячэры з-пад абруса выцягваюць травінкі сена і па даўжыні іх мяркуюць пра будучы ўраджай лёну і каласавых; хто выцягне сучкаватую і тоўстую травінку, той будзе багатым і г.д. Варажба, пачаўшыся з каляднай куцці, ідзе ўсе святы аж да Хрышчэння" (Сахараў, 1940).

Народам Еўропы таксама вядома абрадавая сямейная страва. Так у многіх краінах існуе звычай «мачання ў кацёл». Звычайна перад лазняй усе прыходзяць памачаць белым хлебам у кацёл, дзе варылася мяса. У XIX ст. шведы выносілі ў гумно кашу для Дзеда Мароза, хатніка і троля (КЗ, 1973. С. 112).

(Гл. 6 студзеня).

**25/12.** ***Ражаство каталіцкае (Каляды).***

На Мядзяльшчыне кажуць: "Калі польскія Каляды трашчаць, дык нашы плюшчаць, калі ж польскія плюшчаць, то нашы трашчаць".

(Гл. 7 студзеня).

**Спірыдон Сонцаварот.**

Нагляданне за нябеснымі свяцiламі і зменамі ў прыродзе дазваляе дапытліваму чалавеку звярджаць, што пасля Спірыдона Сонцаварота дзень прыбавіцца хоць на адзін вераб'іны скок.

Царкоўны каляндар ушаноўвае свяціцеля Спірыдона-цудатворца, епіскапа Трымiфунтскага (памёр 348 г.).

Балгары верылі, што святы дапамагае ад скураных хвароб і рыхтавалі пірог «калаці», які раздавалі «на здароўе».

У румынаў Spiridon (12 снежня) – апякун сапожнікаў. Ведаючы, што дзень заўважна расце, гаварылі: «Певень – на забор» (КЗ, 1973. С. 287). Грэкі таксама гэта заўважалі. «Пасля дня Спірыдона дні растуць хутчэй ураджая». Святы – абаронца ад чумы, язвы і воспы. Асабліва яго шануюць на востраве Корфу (Керкіра), дзе захоўваюцца яго «мошчы».

У рускіх на Спірыдона Сонцаварота мядзведзь на другі бок пераварочваецца. На роды Еўропы аддаюць функцыю сонцаварота яшчэ Луку (13 сн.). Італьянцы лічаць, што ад Лукі да Раства дзень прыбавіцца на сабачы крок (Ярмолаў, 1901. С. 586).

**26/13.** ***Сцяпан.***

Другі дзень каталіцкіх Каляд. У мінулым -- дзень найму батракоў. "На святы Сцяпан кожны сабе пан" (Кіркор, 1882; Слупскі, 1892).

Католікі Нідэрландаў і Бельгіі адзначаюць памяць Стэфана, які з'яўляецца апекуном свойскай жывёлы, асабліва коней, і якім аказваецца вялікая ўвага. Такім

жа важным другі дзень года з'яўляецца ў Англіі, дзе існуе нямала звычаяў звязаных з магіяй, так зв. першых дзён.

У скандынаўскіх народаў бытуе звычай выезду раніцай «вершнікаў святога Стэфана» (Staffansriddarna), якія спяваюць у дварах за пачастункі песні Стэфана (Staffansvisan). А вечарам адбываюцца вясёлыя танцы, паданні, гульні з арэхамі і інш. (КЗ, 1973. С. 113). Шмат падобнага на дзень Тапані наглядаецца ў фінаў: першы аб'езд жарабяці, гульні моладзі, хаджэнне раждзественскай «казы», «жураўля», «вершніка», «зорных хлопчыкаў» (tiernan) ці «хлопчыкаў Тапані» (tapanipojat) (с. 132).

У Югаславіі на другі дзень Раства (Божјn дан – сербы, Stjepan – харваты, Stefanovo – славенцы) раскідвалі па палях рытуальную салому, ездзілі па іх на конях і крапілі асвячонай вадой, дамаўляліся аб узаемадапамозе, існавала шмат іншых звычаяў і павер'яў (с. 256).

**31/18.** ***Багатая (Шчодрая) куцця*** (гл. 13 студзеня).

***Сільвестр.***

На "Сільвестраву ноч" дзяўчаты варожаць (БК, 1928).

Сільвестраў дзень (2 студзеня) у балгар – пераважна «Валовае свята».

У дзень святога Сільвестра напярэдадні Новага года, у італьянскіх вёсках моладзь здаўна хадзіла з віншавальнымі песнямі, атрымліваючы частаванні. Існуюць розныя прыкметы і звычаі гадаць (кіданне туфелькі, расплаўленае волава ў вадзе, фасоля пад падушкай і інш.) (КЗ, 1973. С. 26). Таму, хто апошні прачнуўся ў галандцаў, даць клічку «Сільвестр» і бяруць з яго выкуп.

Напярэдадні Новага года ў некаторых краінах Еўропы існаваў звычай маскараднага пераапранання, асабліва папулярны казёл. Нямала прыкмет, звычаяў, дзявочай варажбы вядома многім народам Еўропы.

Аўстрыйскія дзеці ў апошні дзень вучобы праводзяць свята «Школьны Сільвестр».

**Мадэст.**

Лічыцца апекуном свойскай жывёлы. Прысвятак прызначаецца свяціцелю Мадэсту Іерусалімскаму.

Румыны таксама ў гэта дзень (18 сн.) са святаром праводзілі абрады па захаванасці жывёлы ад падзежу і хвароб.

**Марк.**

Малапрыкметнаму Марку дапасавана прымаўка: "Марка да Варка -- няхай будзе парка". У царкоўным календары Марк -- адзін з пакутнікаў з дружыны Севасціяна, якая пацярпела за Хрыста ў Рыме каля 287 года.

У самы апошні дзень года наглядалі за прыродай , надвор'ем: якое надвор'е перад Новым годам -- такое будзе й перад Пятром; светлае неба -- на багатую куццю, вясёлы год; калі перад Васілём (1 студзеня) снег -- чакаецца добры ўраджай (БСК, 1937).

У апошнія два года даўней заканчваўся тэрмін службы на пана. Ён мусіў шукаць новых работнікаў. Гэта добра адлюстравана ў калядных песнях:

Тыдзен, тыдзень да Каляд,
Наш пан чэлядзі не рад.
Пайшла чэлядзь скачучы,

А пан за ёю плачучы:
-- Вярніся, чэлядзь, вярніся,
На другі гадок найміся.

Слугі прасілі разлік, ішлі на святы.

-- Скажу, пан, табе без спорак,
Мне ўжо твой хлеб стаў горак.
Аддай, пан, мне каляду,
Ужо я ад цябе пайду.

Былі выказванні і больш вострымі:

-- Каб ты, пане, не даждаў,
Як табе я буду слугаваць...

... -- Ах, каб ты, панок, не даждаў,
Твая пані ліхая
На мяне брахала...